**ГЕНЕРА́ЛЬНЫ ПЛАН**, асноўны дакумент, які вызначае перспектыву горадабуд. дзейнасці па пераўтварэнні прасторы жыццядзейнасці людзей з улікам функцыянальных, эканам., сац., экалагічных, эстэтычных фактараў. Прадугледжвае рацыянальнае заніраванне тэр. з вылучэннем кампазіцыйнага каркасу (магістралей, рэк, «зялёных калідораў» і інш.), інжынерна-транспартнай інфраструктуры, гіст. і агульнагар. цэнтраў, зон новай забудовы, сістэм гар. абслугоўвання, водна-зялёных сістэм.

Першымі прататыпамі Г.п. развіцця бел. гарадоў былі т.зв. чарцяжы («Чарцёж» Віцебска, 1664). З 1778 распрацоўваліся праектныя планы рэгулярнай планіроўкі частак горада (Полацк) і перабудовы гарадоў (Магілёў, Віцебск). У 1800 праектныя планы былі арыентаваны на ўзбуйненне гар. кварталаў, развіццё транспартных камунікацый, арганізацыю новых плошчаў (Мінск, Пінск, Бабруйск). Праекты планіроўкі бел. гарадоў 19 — пач. 20 ст. прадугледжвалі фарміраванне рэгулярнай забудовы з прамавугольнай сеткай вуліц. Горадабуд. дзейнасць Беларусі ў 1920—30-я гг. рэгулявалася на ўзроўні праектных планаў, распрацаваных архітэктарамі Расіі (праекты планіроўкі Мінска, Гомеля) і Украіны (праект планіроўкі Віцебска). З утварэннем у 1933 праектнага ін-та «Белдзяржпраект» Г.п. развіцця бел. гарадоў пачалі распрацоўваць айчынныя архітэктары. У Г.п. 1950—80-х гг. вызначаны кампазіцыйныя асаблівасці вял. гарадоў з поліцэнтрычнай лінейна-восевай структурай грамадскіх цэнтраў зорчатага (Гомель, Віцебск) або веернага тыпу (Брэст, Пінск) і малых гарадоў з монацэнтрычнай кампазіцыяй грамадскага цэнтра. Перспектыўныя планы развіцця гарадоў Беларусі распрацаваны ў 1990—2000-я гг. Горадабуд. стратэгія развіцця абл. цэнтраў і сталіцы Беларусі зацверджана ў 2003 указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Новыя Г. п. развіцця гарадоў Беларусі распрацоўваюцца арг-цыяй «БелНДІПгорадабудаўніцтва», Г.п. Мінска — ін-там «Мінскграда».

Канцэпцыя Г.п. сучаснага бел. горада прадугледжвае вылучэнне этапаў развіцця на блізкую (да 10 гадоў) і далёкую (да 30 гадоў) перспектыву. Сучасныя Г.п. рэгламентуюць палітыку развіцця тэр., сістэму горадабуд. абмежаванняў, праектныя вырашэнні па развіцці тэрыторый.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ